© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

# ДРТ–2021 г.

# Тэматычнае кансультаванне па беларускай мове

## Варыянт 1

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А1.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) горад ***Слуцк***;<br>2) часопіс «***роднае*** слова»;<br>3) ***Васілёў*** партфель;<br>4) грыб ***падбярозавік***;<br>5) вуліца ***Імя*** Максіма Танка.<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | 1) *горад* ***Слуцк*** → выдзеленае слова напісана правільна: назоўнік, які абазначае назву населенага пункта, з'яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>2) *часопіс «****Роднае*** *слова»* → першае слова ў састаўной назве часопіса пішацца з вялікай літары;<br>3) ***Васілёў*** *партфель* → выдзеленае слова напісана правільна: прыналежны прыметнік, утвораны ад уласнага назоўніка пры дапамозе суфікса -***ёў***-, пішацца з вялікай літары;<br>4) *грыб* ***падбярозавік*** → выдзеленае слова напісана правільна: назоўнік, які абазначае назву грыба, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>5) *вуліца* ***імя*** *Максіма Танка* → у назве вуліцы агульны назоўнік ***імя*** пішацца з малой літары | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Ужыванне вялікай літары | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 9, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 24, 48.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 18, 27.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 19 |
| **А2.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) жэмчужына;<br>2) глатаць;<br>3) шэдэўр;<br>4) чарнавалосы;<br>5) рэдканаселены.<br><br>**Адказ:** 3,5 | 1) *жамчýжына* → запазычанае слова, у якім у адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем не пад націскам пішацца літара ***а***;<br>2) *глытáць* → спрадвечна беларускае слова, у якім замест літары ***о*** не пад націскам пішацца літара ***ы*** (-***ло***- чаргуецца з -***лы***-): *глóтка – глытáць*; | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 34.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 3) *ш**э**дэ́ўр* → слова напісана правільна: пасля зацвярдзелага зычнага [***ш***] у сярэдзіне запазычанага слова не пад націскам захоўваецца літара ***э***;<br>4) *ч**о**рнавало́сы* → складанае слова, у першай частцы якога пішацца літара ***о***, бо націск падае не на першы склад другой яго часткі;<br>5) *р**э**дканасе́лены* → слова напісана правільна: у першай частцы складанага слова незалежна ад месца націску захоўваецца літара ***э*** | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; С. 59–61.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 8 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А3.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) бяскарысны;<br>2) вогнетрывалы;<br>3) сувезь;<br>4) тэлефон;<br>5) мецеліца.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) *б**е**скары́сны* → спрадвечна беларускае слова, у якім не ў першым пераднаціскным складзе пішацца літара ***е***;<br>2) *вогн**е**трыва́лы* → слова напісана правільна: складанае слова, у якім пішацца злучальная літара ***е***, бо націск падае не на першы склад другой яго часткі;<br>3) *су́в**я**зь* → спрадвечна беларускае слова, у корані якога незалежна ад месца націску захоўваецца літара ***я***;<br>4) *тэл**е**фо́н* → слова напісана правільна: запазычанае слова, у якім незалежна ад месца націску пішацца літара ***е***;<br>5) *м**я**це́ліца* → спрадвечна беларускае слова, у якім у першым складзе перад націскам пішацца літара ***я*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 35.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 10.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; С. 59–61.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 9 |
| **А4.** Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):<br>1) запрасіл;<br>2) лавка; | 1) *запрасі**ў*** → дзеяслоў, у якім у форме прошлага часу мужчынскага роду адбылося чаргаванне зычных гукаў [***л***] / [***ў***] (*запрасі**ла*** – *запрасі**ў***); | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 3) раўніна;<br>4) страус;<br>5) фаўна.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 2) *лаўка* → слова, у якім перад зычным гукам [***к***] адбылося чаргаванне зычных гукаў [***в***] / [***ў***] (*ла́ва – лаўка*);<br>3) *раўніна* → слова напісана правільна: пасля галоснага не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае);<br>4) *страус* → слова напісана правільна: у запазычаным слове, якое заканчваецца на ***-ус***, пішацца літара ***у*** (складовае);<br>5) *фаўна* → слова напісана правільна: у сярэдзіне запазычанага слова не пад націскам пасля галоснага пішацца літара ***ў*** (нескладовае) | Правапіс ***у–ў*** | ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 18.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 14 |
| **А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) інтэрв'ю;<br>2) ліпеньскі;<br>3) штосці;<br>4) голубь;<br>5) здароў'е.<br><br>**Адказ:** 1,2 | 1) *інтэрв'ю* → слова напісана правільна: у сярэдзіне слова пасля губнога зычнага гука [***в***] перад літарай ***ю***, што абазначае два гукі [***йу***], пішацца *апостраф*;<br>2) *ліпеньскі* → слова напісана правільна: у прыметніку, утвораным пры дапамозе суфікса ***-ск-*** ад назвы месяца на ***-нь*** (*ліпень*), пішацца *мяккі знак*;<br>3) *штосьці* → у постфіксе ***-сьці*** пішацца *мяккі знак*;<br>4) *голуб* → пасля літары ***б*** *мяккі знак* не пішацца;<br>5) *здароўе* → пасля ***ў*** (нескладовага) *апостраф* не пішацца | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс мяккага знака і апострафа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 5, 6.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 16.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 39.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 51.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 18 |
| **А6.** Адзначце словы (формы слоў), у якіх выдзеленыя гукі вымаўляюцца падоўжана і на пісьме перадаюцца падвоеным напісаннем адпаведнай літары:<br>1) узбярэ[**ж**]а;<br>2) знойдзе[**н**]ыя;<br>3) наве[**л**]а;<br>4) белару[**с**]кі;<br>5) світа[**н’**]е.<br><br>**Адказ:** 1,5 | 1) *узбярэ**жжа*** → падаўжэнне зычнага гука [***ж***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***жж***);<br>2) *знойдзе**ныя*** → у суфіксе -***ен***- дзеепрыметніка пішацца адна літара ***н***;<br>3) *наве**ла*** → слова іншамоўнага паходжання, у якім падаўжэнне зычнага гука не адбываецца і пішацца адна літара ***л***;<br>4) *белару**скі*** → прыметнік, утвораны пры дапамозе суфікса -***ск***- ад назоўніка з асновай на зычны гук [***с***] (*белару**с**-* + *-**ск**-*), пішацца з адной літарай ***с***;<br>5) *світа**нне*** → падаўжэнне зычнага гука [***н’***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***нн***) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 19.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 39.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 51.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 16 |
| **А7.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***с***:<br>1) _часце;<br>2) про_ьба;<br>3) падпі_чык;<br>4) ука_ка;<br>5) ра_чырванецца.<br><br>**Адказ:** 2,3,5 | 1) ***ш****часце* → літара ***ш*** у гэтым слове пішацца адпаведна з літаратурным вымаўленнем: [*шча́с'ц'э*];<br>2) *про****с****ьба* → азванчэнне зычнага гука [***с'***] пры вымаўленні перад звонкім зычным [***б***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*про́з'ба*]; правяраем: *прасіць*; пішам: *просьба*;<br>3) *падпі****с****чык* → прыпадабненне свісцячага зычнага гука [***с***] пры вымаўленні да шыпячага зычнага [***ч***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*патпі́шчык*]; правяраем: *падпісаць*; пішам: *падпісчык*;<br>4) *ука****з****ка* → аглушэнне зычнага гука [***з***] пры вымаўленні перад глухім зычным [***к***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*ука́ска*]; правяраем: *указаць*; пішам: *указка*;<br>5) *ра****с****чырванецца* → прыпадабненне свісцячага зычнага гука [***с***] пры вымаўленні да шыпячага зычнага [***ч***] на пісьме ў | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Зычныя гукі. Іх вымаўленне і правапіс. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 1, 2.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; §§ 13, 14, 21.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 16.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | прыстаўцы ***рас***- не перадаецца; вымаўляем: [*рашчырван’ẑцца*]; пішам: *расчырванецца* | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; §§ 12, 17 |
| **А8.** Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць прыстаўку:<br>1) выканаўчы;<br>2) узаемнасць;<br>3) паснедаць;<br>4) заклапочаны;<br>5) пазітыўна.<br><br>**Адказ:** 3,4 | 1) *выканаўчы* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі; аднакаранёвыя словы: *выканаўца*, *выканаць*;<br>2) *узаемнасць* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі; аднакаранёвыя словы: *узаемны*, *узаемна*;<br>3) *паснедаць* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***па***-; аднакаранёвыя словы: *снеданне*, *снедаць*;<br>4) *заклапочаны* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***за***-; аднакаранёвыя словы: *кло́пат*, *клапаціцца*;<br>5) *пазітыўна* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі; аднакаранёвыя словы: *пазітыў*, *пазітыўны* | Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Марфемы як структурна значымыя часткі слова | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 24–27.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; С. 47.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 10–14.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 23 |
| **А9.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (псеўда) культура;<br>2) (дом) музей;<br>3) (машына) будаванне;<br>4) (паў) лімона;<br>5) (Рымскі) Корсакаў.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) *псеўдакультура* → назоўнік з пачатковай іншамоўнай часткай ***псеўда***- пішацца разам;<br>2) *дом-музей* → складаны назоўнік, утвораны ад двух самастойных слоў ***дом*** і ***музей*** без злучальнай літары, пішацца праз злучок;<br>3) *машынабудаванне* → складаны назоўнік, утвораны шляхам спалучэння дзвюх асноў ***машын***- і ***будаванн***- з дапамогай злучальнай літары ***а***, пішацца разам;<br>4) *паўлімона* → складаны назоўнік са скарочанай пачатковай часткай ***паў***- пішацца разам; | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 27.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 5) *Рымскі-Корсакаў* → складаны назоўнік, які абазначае састаўное прозвішча, пішацца праз злучок | | вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 20 |
| **А10.** Адзначце словы, якія трэба пісаць разам:<br>1) (блакітна) шэры;<br>2) (супер) модны;<br>3) (нава) полацкі;<br>4) (праца) здольны;<br>5) (літаратурна) музычны.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) *блакітна-шэры* → складаны прыметнік, які абазначае колер і яго адценне, пішацца праз злучок;<br>2) *супермодны* → прыметнік з пачатковай іншамоўнай часткай ***супер-*** пішацца разам;<br>3) *наваполацкі* → пішацца разам складаны прыметнік, утвораны ад складанага назоўніка ***Наваполацк***, які пішацца ў адно слова;<br>4) *працаздольны* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***здольны да працы***), пішацца разам;<br>5) *літаратурна-музычны* → складаны прыметнік, утвораны ад двух раўназначных слоў ***літаратурны*** і ***музычны***, пішацца праз злучок | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 54.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 20 |
| **А11.** Адзначце правільна напісаныя лічэбнікі:<br>1) восемь;<br>2) дзьвесце;<br>3) пяцьдзесят;<br>4) трыццаць;<br>5) дзясяты.<br><br>**Адказ:** 4,5 | 1) *восем* → у лічэбніку ***восем*** пасля губнога зычнага гука [***м***] мяккі знак не пішацца;<br>2) *дзвесце* → пасля мяккага зычнага гука [***дз’***] перад мяккім зычным гукам [***в’***] мяккі знак не пішацца, бо пры змене слова або падборы аднакаранёвага слова абодва зычныя застаюцца мяккімі ці становяцца цвёрдымі: [***дз’в’***]*е*, [***дз’в’***]*юм*, [***дв***]*ухсот*, [***дв***]*умастамі*;<br>3) *пяцьдз**я**сят* → у колькасным лічэбніку ***пяцьдзяся́т*** у першым складзе перад націскам пішацца літара ***я***;<br>4) *тры**цц**аць* → лічэбнік напісаны правільна: у сярэдзіне колькаснага лічэбніка ***трыццаць*** пішуцца дзве літары ***ц*** (***цц***);<br>5) *дз**я**сяты* → лічэбнік напісаны правільна: у парадкавым лічэбніку ***дзяся́ты*** ў першым складзе перад націскам пішацца літара ***я*** | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46, 47.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 58–60.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 34.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 29 |
| **А12.** Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак ***-ым*** (***-ім***):<br>1) бегчы;<br>2) утвараць;<br>3) выспацца;<br>4) падказаць;<br>5) падкрэсліць.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *бегчы – бяжым* → рознаспрагальны дзеяслоў незакончанага трывання ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае канчатак ***-ым***;<br>2) *утвараць – утвараем* → дзеяслоў I спражэння незакончанага трывання ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на мяккі зычны гук (<u>*утвара*[***й***э]</u>*м*) мае канчатак ***-ем***;<br>3) *выспацца – выспімся* → дзеяслоў II спражэння закончанага трывання ў форме 1-й асобы множнага ліку будучага простага | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Трыванне дзеяслова. Канчаткі дзеясловаў I і II спражэнняў, іх правапіс.<br>Рознаспрагальныя дзеясловы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 10.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | часу пасля асновы на мяккі зычны гук мае канчатак -***ім***;<br>4) *падказаць – падкажам* → дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 1-й асобы множнага ліку будучага простага часу не пад націскам пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае канчатак -***ам***;<br>5) *падкрэсліць – падкрэслім* → дзеяслоў II спражэння закончанага трывання ў форме 1-й асобы множнага ліку будучага простага часу пасля асновы на мяккі зычны гук мае канчатак -***ім*** | | вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 61, 65, 66.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 13, 17, 18.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; практ. 320.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 31 |
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) выцерці ***начыста***;<br>2) ***абы-як*** не паклеіш;<br>3) ***знадворку*** пахаладала;<br>4) пераскочыць ***зразбегу***;<br>5) зрабіць ***пасвойму***.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | 1) *выцерці* ***начыста*** → выдзеленае слова напісана правільна: прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння прыслоўя ***чыста*** і прыназоўніка ***на***, пішацца разам;<br>2) ***абы-як*** *не паклеіш* → выдзеленае слова напісана правільна: прыслоўе з прыстаўкай ***абы-*** пішацца праз злучок;<br>3) ***знадворку*** *пахаладала* → выдзеленае слова напісана правільна: прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння прыназоўніка ***з*** са склонавай формай назоўніка ***надворак***, пішацца разам;<br>4) *пераскочыць* ***з разбегу*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка з прыназоўнікам пішацца асобна;<br>5) *зрабіць* ***па-свойму*** → прыслоўе, якое мае прыстаўку ***па-*** і заканчваецца на -***йму***, пішацца праз злучок | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 27–30.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 38–40.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 19, 43; практ. 344.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 20 |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) ***не дасаліць*** рагу;<br>2) ***непазначаныя*** нумары;<br>3) ***ненабыўшы*** кнігі;<br>4) вершы ***не надрукаваны***;<br>5) ***не глыбокае***, а мелкае возера.<br><br>**Адказ:** 2,4,5 | 1) ***недасаліць*** *рагу* → прыстаўка ***неда-*** з дзеясловам, які мае значэнне непаўнаты дзеяння, пішацца разам;<br>2) ***непазначаныя*** *нумары* → выдзеленае слова напісана правільна: ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім няма залежнага слова, пішацца разам;<br>3) ***не набыўшы*** *кнігі* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна;<br>4) *вершы* ***не надрукаваны*** → выдзеленае слова напісана правільна: ***не*** з кароткім дзеепрыметнікам пішацца асобна;<br>5) ***не глыбокае****, а мелкае возера* → выдзеленае слова напісана правільна: ***не*** з прыметнікам ***глыбокае*** пішацца асобна, бо ёсць супрацьпастаўленне (***не глыбокае, а мелкае***) | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 42, 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 12, 15, 47.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 8, 27, 29.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 5.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 48 |
| **A15.** Адзначце сказы, у якіх падкрэсленая часціца ***не*** ўжыта правільна:<br>1) ***Не*** раз я «Новую зямлю» яшчэ перачытаю.<br>2) Хто б ***не*** праходзіў каля хаты майго дзядулі, абавязкова спыняўся палюбавацца распіснымі аканіцамі.<br>3) Быць дажджу, калі ***не*** расінкі раніцай на лузе.<br>4) Якіх толькі колераў ***не*** пабачыш у маі!<br>5) На моры ***не*** бывае цішыні.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | 1) ***Не*** *раз я «Новую зямлю» яшчэ перачытаю.* → у спалучэнні ***не раз*** са значэннем *'часта'* ўжываецца часціца ***не***;<br>2) *Хто б* ***ні*** *праходзіў каля хаты майго дзядулі, абавязкова спыняўся палюбавацца распіснымі аканіцамі.* → для ўзмацнення сцвярджэння ў дадзенай частцы складаназалежнага сказа *Хто б ні праходзіў каля хаты майго дзядулі* ўжываецца часціца ***ні***;<br>3) *Быць дажджу, калі* ***ні*** *расінкі раніцай на лузе.* → для надання адмоўнага значэння дадзенай частцы складаназалежнага сказа *калі ні расінкі раніцай на лузе*, у якой няма дзейніка, ужываецца часціца ***ні***; часціца стаіць пры назоўніку ***расінкі*** ў форме роднага склону;<br>4) *Якіх толькі колераў* ***не*** *пабачыш у маі!* → для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу ўжываецца часціца ***не***;<br>5) *На моры* ***не*** *бывае цішыні.* → для надання адмоўнага значэння сказу пры дзеяслове-выказніку ўжываецца часціца ***не*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 46.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 51.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 47 |
| **A16.** Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) пажартаваць над сынам;<br>2) дужэйшы мядзведзя;<br>3) падзякаваць памочніку;<br>4) віншаваць з нагоды свята;<br>5) вышываць па вечарах.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *пажартаваць з сына* → пры дзеяслове ***пажартаваць*** назоўнік ужываецца ў форме роднага склону з прыназоўнікам ***з***;<br>2) *дужэйшы за мядзведзя* → пры прыметніку ў форме вышэйшай ступені параўнання ***дужэйшы*** назоўнік ужываецца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***за***;<br>3) *падзякаваць памочніку* → словазлучэнне адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы: пры дзеяслове са значэннем ветлівасці ***падзякаваць*** назоўнік ужываецца ў форме давальнага склону;<br>4) *віншаваць з нагоды свята* → словазлучэнне | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 8; практ. 55.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; С. 55, 56.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы: характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя;<br>5) *вышываць па вечарах* → словазлучэнне адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы: пры дзеяслове са значэннем дзеяння ***вышываць*** ужываецца назоўнік у форме меснага склону з прыназоўнікам ***па*** | | беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9; С. 242–244 |
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленае слова – ***дзейнік***:<br>1) Вачамі сініх азёраў глядзіцца ***Радзіма*** ў празрыстыя высі нябёс.<br>2) Як добра пастаяць у цішы і паслухаць тваё дыханне, ***Нарач***!<br>3) З песні ***слова*** не выкінеш.<br>4) Люблю зіму з яе марозам, ***што*** вокны прыбярэ ва ўзор.<br>5) Вядомы ***гарманіст*** наш Васіль.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *Вачамі сініх азёраў глядзіцца <u>Радзіма</u> ў празрыстыя высі нябёс.* → ***Радзіма*** – дзейнік, які абазначае прадмет маўлення і адказвае на пытанне назоўнага склону *што?*; дзейнік выражаны назоўнікам;<br>2) *Як добра пастаяць у цішы і паслухаць тваё дыханне, Нарач!* → зваротак ***Нарач*** членам сказа не з’яўляецца;<br>3) *З песні <u>слова</u> не выкінеш.* → ***слова*** – дапаўненне, якое адносіцца да дзеяслова-выказніка ***не выкінеш*** і адказвае на пытанне роднага склону *чаго?*; дапаўненне выражана назоўнікам;<br>4) *Люблю зіму з яе марозам, <u>што</u> вокны прыбярэ ва ўзор.* → ***што*** – дзейнік, які абазначае прадмет маўлення і адказвае на пытанне назоўнага склону *што?*; дзейнік выражаны адносным займеннікам;<br>5) *Вядомы <u>гарманіст</u> наш Васіль.* → ***гарманіст*** – выказнік, які абазначае тое, што гаворыцца аб прадмеце маўлення (дзейніку *Васіль*), і адказвае на пытанне (*хто ён такі?*); выказнік выражаны назоўнікам | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Дзейнік, спосабы яго выражэння.<br>Выказнік, спосабы яго выражэння.<br>Дапаўненне. Спосабы выражэння дапаўнення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; §§ 13–15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 19, 21.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 16, 19, 24, 43.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 15, 18, 23, 37.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 14, 15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; § 16.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 14,17 |
| **А18.** Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць прыведзенаму сказу:<br>*У роднай хаце, згадзіцеся, у любую пару і ў любое надвор'е ўтульна.*<br>1) аднасастаўны сказ;<br>2) двухсастаўны сказ;<br>3) галоўны член сказа – выказнік, выражаны прыслоўем;<br>4) галоўныя члены сказа – дзейнік, выражаны назоўнікам; выказнік, выражаны дзеясловам;<br>5) галоўны член сказа – выказнік, выражаны дзеясловам.<br><br>**Адказ:** 1,3 | *У роднай хаце, згадзіцеся, у любую пару і ў любое надвор'е ўтульна.* → сказу адпавядаюць сцверджанні пад нумарамі **1, 3:**<br>1) **1** – аднасастаўны сказ; **3** – галоўны член сказа – выказнік, выражаны прыслоўем ***утульна***;<br>2) пабочнае слова ***згадзіцеся*** членам сказа не з'яўляецца | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Двухсастаўныя сказы. Аднасастаўныя сказы, іх будова | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 15–17, 27–31.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 14–16, 25–28.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:<br>1) Зберагчы народную творчасць __ наш абавязак.<br>2) Меладэкламацыя __ мастацкае чытанне вершаў ці прозы на фоне музычнага суправаджэння.<br>3) Родная мова, ты __ самацветаў яскравая нізка!<br>4) Успамінаць __ не вучы́ць.<br>5) Зіхатлівыя зоркі __ што кара́лі.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *Зберагчы народную творчасць – наш абавязак.* → паміж дзейнікам, выражаным інфінітывам, і выказнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>2) *Меладэкламацыя – мастацкае чытанне вершаў ці прозы на фоне музычнага суправаджэння.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>3) *Родная мова, ты самацветаў яскравая нізка!* → паміж дзейнікам, выражаным асабовым займеннікам, і выказнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, працяжнік ***не ставіцца***; | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 20.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 4) *Успамінаць* **–** *не вучыць*. → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі інфінітывам, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>5) *Зіхатлівыя зоркі што каралі*. → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, працяжнік ***не ставіцца***, бо пры выказніку ёсць параўнальны злучнік ***што*** | | Мінск: НІА, 2015; § 12.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 21.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 20 |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:<br>1) Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота__ або нядбайнасць, там пуста.<br>2) Восень надае наваколлю не толькі адценне чысціні, празрыстасці__ але і лёгкае адчуванне суму.<br>3) Успрымаю душой сваю родную мову, адгукаюся сэрцам на пяшчотнае__ бацькоўскае слова.<br>4) Усё было мне міла тут__ над Нёманам зялёны кут, палі шырокія, узгоркі, і смоль сасны, і ў небе зоркі.<br>5) Цяжкая__ затое пачэсная праца ў хлебароба.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) *Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота або нядбайнасць, там пуста.* → аднародныя дзейнікі, звязаныя адзіночным размеркавальным злучнікам ***або***, коскай не раздзяляюцца;<br>2) *Восень надае наваколлю не толькі адценне чысціні, празрыстасці****,*** *але і лёгкае адчуванне суму.* → паміж аднароднымі дапаўненнямі, звязанымі пры дапамозе парнага супраціўнага злучніка ***не толькі – але і***, ставіцца коска;<br>3) *Успрымаю душой сваю родную мову, адгукаюся сэрцам на пяшчотнае бацькоўскае слова.* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якасным прыметнікам ***пяшчотнае*** і адносным прыметнікам ***бацькоўскае***, коска не ставіцца;<br>4) *Усё было мне міла тут****:*** *над Нёманам зялёны кут, палі шырокія, узгоркі, і смоль сасны, і ў небе зоркі.* → ***усё*** – абагульняльнае слова, якое стаіць перад аднароднымі дзейнікамі і пасля якога ставіцца двукроп’е;<br>5) *Цяжкая****,*** *затое пачэсная праца ў хлебароба.* → паміж аднароднымі выказнікамі, звязанымі пры дапамозе | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з абагульняльнымі словамі і без іх) | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 19.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 26, 27.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37–41.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 31–35.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; практ. 41. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | супраціўнага злучніка ***затое***, ставіцца коска | | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 12; практ. 99, 100, 104 |
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Вясковы вецер увесь час__ як бы просіцца ў хату: зімою – пагрэцца, вясной – пасваволіць, летам – ад сонца схавацца, восенню – ад дажджу.<br>2) Дзянёчкі навагоднія__ як на заказ.<br>3) У азёрнай вадзе жоўты адбітак месяца то дрыжаў, то падскокваў__ нібы мячык, то збіраўся ў гармонік, то расцягваўся ў палоску.<br>4) Мне не забыць ніколі адкрытага і яснага__ быццам сонейка__ позірку маёй першай настаўніцы.<br>5) Куфар раней выкарыстоўвалі__ як сховішча для адзення, бялізны, тканіны.<br><br>**Адказ:** 3,4 | 1) *Вясковы вецер увесь час як бы просіцца ў хату: зімою – пагрэцца, вясной – пасваволіць, летам – ад сонца схавацца, восенню – ад дажджу.* → перад выказнікам ***як бы просіцца*** коска не ставіцца;<br>2) *Дзянёчкі навагоднія* **–** *як на заказ.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам ***дзянёчкі***, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам ***як на заказ***, ставіцца працяжнік;<br>3) *У азёрнай вадзе жоўты адбітак месяца то дрыжаў, то падскокваў***,** *нібы мячык, то збіраўся ў гармонік, то расцягваўся ў палоску.* → аддзяляецца коскай параўнальны зварот ***нібы мячык***;<br>4) *Мне не забыць ніколі адкрытага і яснага***,** *быццам сонейка***,** *позірку маёй першай настаўніцы.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***быццам сонейка***;<br>5) *Куфар раней выкарыстоўвалі як сховішча для адзення, бялізны, тканіны.* → не аддзяляецца коскай зварот ***як сховішча для адзення, бялізны, тканіны***, які мае значэнне ‘*ў якасці*’ (*Куфар* і ёсць *сховішча для адзення, бялізны, тканіны*) | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 52, 53.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 45, 46.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Назіраючы за зацьменнем Месяца__ Арыстоцель убачыў, што цень ад Зямлі, які падае на Месяц, заўсёды круглы.<br>2) У ліпавай алеі__ пасыпанай золатам__ зацішак, прахалода і асалода.<br>3) На Купалле знаўцы народнай медыцыны__ | 1) *Назіраючы за зацьменнем Месяца***,** *Арыстоцель убачыў, што цень ад Зямлі, які падае на Месяц, заўсёды круглы.* → аддзяляецца коскай адасобленая акалічнасць ***Назіраючы за зацьменнем Месяца***, выражаная дзеепрыслоўным зваротам;<br>2) *У ліпавай алеі***,** *пасыпанай золатам***,** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 16.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| акрамя кветак для вяночкаў__ збіраюць зёлкі.<br>4) Плён абавязкова будзе, калі працаваць__ не пакладаючы рук.<br>5) Пад выразам «след на зямлі» мы разумеем__ пакінутыя пасля сябе__ словы, учынкі, справы.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | *зацішак, прахалода і асалода.* → выдзяляецца коскамі адасобленае дапасаванае азначэнне ***пасыпанай золатам***, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам і стаіць пасля паяснёнага назоўніка (***у***) ***алеі***;<br>3) *На Купалле знаўцы народнай медыцыны**,** акрамя кветак для вяночкаў**,** збіраюць зёлкі.* → выдзяляецца коскамі адасобленае дапаўненне ***акрамя кветак для вяночкаў***, выражанае назоўнікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікам ***акрамя***;<br>4) *Плён абавязкова будзе, калі працаваць не пакладаючы рук.* → не аддзяляецца коскай акалічнасць ***не пакладаючы рук***, якая з'яўляецца фразеалагізмам;<br>5) *Пад выразам «след на зямлі» мы разумеем пакінутыя пасля сябе словы, учынкі, справы.* → не выдзяляецца коскамі дапасаванае азначэнне ***пакінутыя пасля сябе***, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам, стаіць перад паяснёнымі назоўнікамі ***словы, учынкі, справы*** і не мае дадатковага акалічнаснага значэння прычыны ці ўступкі | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 22, 30.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46, 47, 49, 50.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 39, 40, 42, 43.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Срэбраныя зоркі, а, можа, залатыя зіхацяць у калядным небе.<br>2) Вясёлка, нават, пры сваёй недаўгавечнасці дорыць адчуванне радасці ледзь не на цэлы дзень.<br>3) Самай прыгожай кветачкай, на маю думку, з'яўляецца васілёк.<br>4) Добрае слова кожнаму вядома прыемна пачуць.<br>5) Сяброў (а іх мне лёс паслаў нямала!) я ніколі не дзяліў на блізкіх і на далёкіх. | 1) *Срэбраныя зоркі, а можа, залатыя зіхацяць у калядным небе.* → слова ***можа***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, а ўказвае на меншую ступень упэўненасці ў сказаным, з'яўляецца пабочным; пабочнае слова выдзяляецца коскамі разам з далучальным злучнікам ***а***, які адносіцца да яго;<br>2) *Вясёлка нават пры сваёй недаўгавечнасці дорыць адчуванне радасці ледзь не на цэлы дзень.* → часціца ***нават*** коскамі не выдзяляецца;<br>3) *Самай прыгожай кветачкай, на маю думку,* | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі.<br>Знакі прыпынку ў сказах з устаўнымі канструкцыямі. | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 44.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 38.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** 3,5 | *з'яўляецца васілёк.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: словазлучэнне ***на маю думку***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, а ўказвае на крыніцу паведамлення, з'яўляецца пабочным; пабочнае словазлучэнне выдзяляецца коскамі;<br>4) *Добрае слова кожнаму**,** вядома**,** прыемна пачуць.* → слова ***вядома***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, а ўказвае на большую ступень упэўненасці ў паведамленні, з'яўляецца пабочным; пабочнае слова выдзяляецца коскамі;<br>5) *Сяброў (а іх мне лёс паслаў нямала!) я ніколі не дзяліў на блізкіх і на далёкіх.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: клічны сказ ***а іх мне лёс паслаў нямала!***, які па сэнсе не звязаны з асноўным зместам сказа, а падаецца як дадатковая заўвага, з'яўляецца ўстаўным; устаўны сказ бярэцца ў дужкі або выдзяляецца з двух бакоў працяжнікамі | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Ноч, і цішыня.<br>2) У майскім садочку то вішні вэлюмам акрыюцца, то яблыні нейлонам беленькім ахутаюць свае галінкі.<br>3) Сагравала зямлю сонца цёплымі праменямі, і вясна пралескі шчодра рассыпáла жменямі.<br>4) Ужо з пагоркаў пабеглі раўчукі і дамоў заспяшаліся шпакі.<br>5) Яшчэ дзень-два, і ландышаў званочкі падораць нам чароўны звон.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) *Ноч і цішыня.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія з'яўляюцца назыўнымі сказамі, перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца;<br>2) *У майскім садочку то вішні вэлюмам акрыюцца, то яблыні нейлонам беленькім ахутаюць свае галінкі.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж часткамі складаназлучанага сказа з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі, звязанымі паўторным размеркавальным злучнікам ***то – то***, ставіцца коска;<br>3) *Сагравала зямлю сонца цёплымі праменямі, і вясна пралескі шчодра рассыпáла жменямі.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж часткамі | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 6–11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 10–14.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 16 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** ставіцца коска;<br>4) *Ужо з пагоркаў пабеглі раўчукі і дамоў заспяшаліся шпакі.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коску ставіць ***не трэба***, бо ў першай частцы ёсць агульная для абедзвюх частак акалічнасць ***Ужо***;<br>5) *Яшчэ дзень-два* **–** *і ландышаў званочкі падораць нам чароўны звон.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на хуткую змену падзей і звязаны спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік | | |
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:<br>1) Калі парою лістападу ў вырай птушкі адлятаюць__ яны ў дубровах пакідаюць свае вясновыя напевы, каб не згубіць іх недзе часам у далёкім небе, на чужыне.<br>2) Некалі ў кожным вясковым двары быў серп__ бо ў час жніва без яго не абыходзілася ні адна жанчына.<br>3) З-за небасхілу маленькімі шматкамі выплылі шызаватыя хмаркі, якія даволі хутка пацямнелі__ і з якіх пачынаў накрапваць шорсткі дождж.<br>4) Кажуць, што__ калі на сваё пытанне мы не чуем адказу, то трэба задумацца, бо часам маўчанне і ёсць адказ.<br>5) Ёсць дзіўнае хараство ў тых бялюткіх зімовых кілімах__ззяюць якія крышталём над занямелымі лясамі.<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | 1) *Калі парою лістападу ў вырай птушкі адлятаюць**,** яны ў дубровах пакідаюць свае вясновыя напевы, каб не згубіць іх недзе часам у далёкім небе, на чужыне.* → складаназалежны сказ з дзвюма дадзенымі часткамі, у якім трэба аддзяляць коскай першую дадзеную частку, што звязана з галоўнай пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***калі***;<br>2) *Некалі ў кожным вясковым двары быў серп**,** бо ў час жніва без яго не абыходзілася ні адна жанчына.* → складаназалежны сказ, у якім трэба аддзяляць коскай дадзеную частку, што стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***бо***;<br>3) *З-за небасхілу маленькімі шматкамі выплылі шызаватыя хмаркі, якія даволі хутка пацямнелі і з якіх пачынаў накрапваць шорсткі дождж.* → складаназалежны сказ з дзвюма дадзенымі часткамі, якія паясняюць у галоўнай дзейнік ***хмаркі***, адказваюць на | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 13–21, 23, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 15–24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | адно і тое ж пытанне *якія?* і з'яўляюцца аднароднымі; паміж аднароднымі дадзенымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коску ставіць не трэба;<br>4) *Кажуць, што калі на сваё пытанне мы не чуем адказу, то трэба задумацца, бо часам маўчанне і ёсць адказ.* → складаназалежны сказ з трыма дадзенымі часткамі, у якім паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі*** коску ставіць не трэба, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то***;<br>5) *Ёсць дзіўнае хараство ў тых бялюткіх зімовых кілімах**,** ззяюць якія крышталём над занямелымі лясамі.* → складаназалежны сказ, у якім дадзеную частку, што стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***якія***, трэба аддзяліць коскай | | |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Лес без ветру шуміць, шкло ў вокнах пацее – быць дажджу.<br>2) Даўно вядома – гуртам працаваць весялей.<br>3) Гукнула некага ўначы сава: ніхто не адазваўся.<br>4) На роднай мове звіняць цымбалы, на роднай мове жалейка гучыць.<br>5) У сонечнае надвор'е дзьмухавец падказвае час: яго суквецці-кошыкі адкрываюцца а шостай гадзіне раніцы і закрываюцца а трэцяй гадзіне дня.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | 1) *Лес без ветру шуміць, шкло ў вокнах пацее – быць дажджу.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж першымі дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з'яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (= ***і***); трэцяя частка з'яўляецца абагульняльнай у адносінах да дзвюх папярэдніх, таму перад ёй ставіцца працяжнік;<br>2) *Даўно вядома**:** гуртам працаваць весялей.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо другая частка раскрывае, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>3) *Гукнула некага ўначы сава* **–** *ніхто не адазваўся.* → паміж дзвюма часткамі | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 26–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 25–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 18 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо іх змест супрацьпастаўляецца; паміж часткамі можна ўставіць супраціўны злучнік ***але***;<br>4) *На роднай мове звіняць цымбалы, на роднай мове жалейка гучыць.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з'яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (= ***і***);<br>5) *У сонечнае надвор'е дзьмухавец падказвае час: яго суквецці-кошыкі адкрываюцца а шостай гадзіне раніцы і закрываюцца а трэцяй гадзіне дня.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо другая частка паясняе, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць словы ***а іменна*** | | |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А27.** Адзначце нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак трэба паставіць коску:<br><br>*Сёння пачуў вельмі слушную думку***1)__** *розум багацее ад таго***2)__** *што ён атрымлівае***3)__** *і што захоўвае, а сэрца – ад таго***4)__** *што захоўвае***5)__** *і наколькі дзеліцца ці аддае.*<br><br>**Адказ:** 2,4 | **I** [1]*Сёння пачуў вельмі слушную думку**:*** **II** [2]*розум багацее ад таго**,*** [3]*што ён атрымлівае і* [4]*што захоўвае, а* [5]*сэрца – ад таго**,*** [6]*што захоўвае і* [7]*наколькі дзеліцца ці аддае.* → нумары пропускаў, на месцы якіх трэба паставіць коскі, – **2**,**4**:<br>1) паміж сэнсавымі часткамі **I** і **II**, якія аб’яднаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі, трэба паставіць двукроп’е, бо частка **II** раскрывае, удакладняе змест часткі **I**; паміж часткамі можна ўставіць словы ***а іменна***;<br>2) у сэнсавай частцы **II** паміж граматычнымі часткамі **2** і **3**, звязанымі падпарадкавальнай сувяззю, перад злучальным словам ***што*** трэба паставіць коску;<br>3) у сэнсавай частцы **II** паміж аднароднымі даданымі часткамі **3** і **4**, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коску ставіць не трэба;<br>4) у сэнсавай частцы **II** паміж граматычнымі часткамі **5** і **6**, звязанымі падпарадкавальнай сувяззю, перад злучальным словам ***што*** трэба паставіць коску;<br>5) у сэнсавай частцы **II** паміж аднароднымі даданымі часткамі **6** і **7**, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коску ставіць не трэба | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 31, 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 30, 31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **A28.** Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены): **«П, – а, – п».**<br>1) Вугор на самай справе перапытала ў мяне сястра любіць гарох<br>2) Добры сняжок як кажуць на добры ўраджай<br>3) Што мне свет вялікі без маленькай вёсачкі роднай прагучалі са сцэны вельмі сугучныя маім думкам словы<br>4) Дзеці сказаў настаўнік складаюць трэцюю частку насельніцтва Зямлі<br>5) Пад ляжачы камень прамовіў тата вада не цячэ<br><br>**Адказ:** 4,5 | 1) *«Вугор на самай справе, – перапытала ў мяне сястра, – любіць гарох?»* → сказ не адпавядае прыведзенай схеме: простая мова мае пытальную інтанацыю (**«П, – а, – п?»**);<br>2) *Добры сняжок, як кажуць, на добры ўраджай.* → сказ не адпавядае прыведзенай схеме, бо не з'яўляецца сказам з простай мовай: ***як кажуць*** – пабочная канструкцыя, якая ўказвае на крыніцу паведамлення;<br>3) *«Што мне свет вялікі без маленькай вёсачкі роднай!» – прагучалі са сцэны вельмі сугучныя маім думкам словы.* → сказ не адпавядае прыведзенай схеме: простая мова стаіць перад словамі аўтара і мае клічную інтанацыю (**«П!» – а.**);<br>4) *«Дзеці, – сказаў настаўнік, – складаюць трэцюю частку насельніцтва Зямлі».* → сказ адпавядае прыведзенай схеме: словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы, якая мае апавядальную інтанацыю, і падзяляюць яе на дзве часткі, першая з якіх не з'яўляецца закончаным сказам (**«П, – а, – п».**);<br>5) *«Пад ляжачы камень, – прамовіў тата, – вада не цячэ».* → сказ адпавядае прыведзенай схеме: словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы, якая мае апавядальную інтанацыю, і падзяляюць яе на дзве часткі, першая з якіх не з'яўляецца закончаным сказам (**«П, – а, – п».**) | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 30.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 35, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |

**Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6**

(1) *Нараджэнне дзіцяці – гэта заўсёды радасць!* (2) *Нараджэнне дзіцяці – гэта вялікае свята, якое ў нашых папярэдніх продкаў суправаджалася шматлікімі павер'ямі.*

(3) *Так, напрыклад, пе́ршынцу калыскі ні ў кога не бралі.* (4) *Яна павінна была быць не толькі новая, але і змайстраваная бацькам, бо лічылася, што ў адваротным выпадку дзіця не захоча шанаваць родных.* (5) *Калыску пе́ршынца захоўвалі для гадавання наступных немаўлят, верачы, што тады дзеці пасябруюць і стануць з павагай адносіцца адзін да аднаго.*

(6) *Першую кашулю* ***<u>свайму</u>*** *немаўлятку маці шыла не з новага палатна, а са старызны.* (7) *Ды так, каб не было ў ёй ні каўнерыка, ні рубца з наваротам, – тады дзіця будзе паслухмянае і ласкавае.*

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| (8) *Наступаў перыяд, у які даведваліся пра лёс сына альбо **дачкі**.* (9) *Перад дзіцяткам клалі грошы, пугу і кнігу.* (10) *Калі яно брала грошы, дык азначала, што стане багатым, пугу – гаспадарлівым.* (11) *Калі ж дзіцятка выбірала кнігу, то яму прарочылі вучонасць і жадалі поспеху на ніве асветы.*<br>(12) *Шмат чаго прыдумлівалі нашы разумныя дзяды і прадзеды, каб заахвоціць дзіця хутчэй пайсці і **загаварыць**.* (13) *Рабілі хадункі, расказвалі казкі, спявалі песні, весялілі пацешкамі і скорагаворкамі.* (14) *І яшчэ адзін **важны** клопат праяўлялі бацькі: яны старанна выхоўвалі ў сваіх сыночкаў і дачушак працавітасць.* (15) *Ніколі не быць гультаём і не праслыць ім – вось тая жыццёвая мудрасць, якую абавязкова трэба было засвоіць дзецям.* | | | |
| **А29.** Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст гутарковага стылю;<br>2) тэкст афіцыйнага стылю;<br>3) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>4) тэкст навуковага стылю;<br>5) тэкст мастацкага стылю.<br><br>**Адказ:** 3 | тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам **3**: тэкст ***публіцыстычнага стылю***, таму што:<br>1) адрасат тэксту з’яўляецца масавым;<br>2) асноўная задача аўтара тэксту – паведаміць інфармацыю і ўздзейнічаць на думкі чытача, выклікаючы пэўны водгук;<br>3) матэрыял тэксту пададзены лаканічна, даходліва; характэрныя яму ацэначнасць і вобразнасць тлумачацца тым, што аўтар, перадаючы інфармацыю, выражае да яе сваё стаўленне;<br>4) у тэксце ёсць моўна-выяўленчыя сродкі, характэрныя для публіцыстычных жанраў: словы з памяншальна-ласкальным значэннем (*каўнерыка*, *дзіцяткам*, *сыночкаў*, *дачушак*); моўныя штампы (*на ніве асветы*, *у адваротным выпадку*); клічны сказ (*Нараджэнне дзіцяці – гэта заўсёды радасць!*) і іншыя сродкі, характэрныя для тэкстаў публіцыстычнага стылю | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 3, 4.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 13, 57.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 7–9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2. |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 6.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 10, 11, 33.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; § 7.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 4–8 |
| **А30.** У адным са сказаў ***11–15*** тэксту вызначце словы, форма якога не адпавядае марфалагічнай ці арфаграфічнай норме. З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў ***11–15***:<br>1) поспеха;<br>2) прыдумвалі;<br>3) нашыя;<br>4) разумные;<br>5) некалі.<br><br>**Адказ:** 2 | 1) *прыдумвалі* → дзеяслоў ***прыдумваю***, які ў форме 1-й асобы адзіночнага ліку заканчваецца на ***-ваю***, у форме прошлага часу мае суфікс ***-ва-*** | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 18, 35, 53, 62.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 33, 47, 68.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 21, 26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 14, 35, 42.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 29, 32, 36, 37, 43 |
| **В1.** Знайдзіце ў ***2-м*** сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў ***2-м*** сказе.<br><br>**Адказ:** папярэдніх | 1) *папярэдніх* → ужытае ў ***2-м*** сказе тэксту слова ***продак*** (у сказе ***продкаў***) мае значэнне ‘*старажытны папярэднік па родзе*’, таму слова ***папярэдніх*** у сказе збыткоўнае | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы (лексічныя) сучаснай беларускай літаратурнай мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 6.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 1.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 1.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага |

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| | | | ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 2 |
| **B2.** Знайдзіце ў ***2-м*** сказе тэксту часціцу і запішыце яе.<br><br>**Адказ:** гэта | 1) *гэта* → у ***2-м*** сказе тэксту ўжыта ўказальная часціца ***гэта***, якая выдзяляе, падкрэслівае выказнік ***свята*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Службовыя часціны мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 43, 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 49, 50.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 45 |
| **B3.** Запішыце падкрэслены ў ***8-м*** сказе тэксту назоўнік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** дачцэ | 1) *дачцэ* → назоўнік 1-га скланення ***дачка́*** з асновай на зычны гук [***к***] у форме давальнага склону адзіночнага ліку пад націскам мае канчатак ***-э*** – ***дачцэ́***; пры скланенні гук [***к***] чаргуецца з гукам [***ц***] | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Назоўнікі 1-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 6. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 17.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 29 |
| **В4.** Запішыце падкрэслены ў ***14-м*** сказе тэксту прыметнік у простай форме вышэйшай ступені параўнання, назоўным склоне, адзіночным ліку, мужчынскім родзе.<br><br>**Адказ:** важнейшы | 1) *важнейшы* → простая форма вышэйшай ступені параўнання ўтвараецца ад пачатковай формы якаснага прыметніка ***важны*** пры дапамозе суфікса -***ейш***-; форма назоўнага склону, адзіночнага ліку, мужчынскага роду – ***важнейшы*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 45 |
| **В5.** Запішыце падкрэслены ў ***6-м*** сказе тэксту займеннік у форме роднага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** свайго | 1) *свайго* → прыналежны займеннік ***свой*** у родным склоне адзіночнага ліку мае форму ***свайго*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне і правапіс займеннікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 68.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 35 |
| **В6.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***12-м*** сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе і запішыце яго.<br><br>**Адказ:** загаварыўшы | 1) *загаварыўшы* → ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання ***загаварыць*** з дапамогай суфікса ***-ўшы*** ўтвараецца дзеепрыслоўе закончанага трывання ***загаварыўшы*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трыванняў, іх утварэнне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 18.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 40.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 32 |
| **В7.** З двух прапанаваных у дужках слоў вызначце тое, што адпавядае сэнсу сказа. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно павінна быць ужыта ў сказе:<br><br>*Шмат разоў даводзілася Рыгору Раманавічу Шырме займацца (журнальнай, журналісцкай) дзейнасцю – выступаць у друку, каб падтрымаць народную песню і пераканаць у адваротным тых людзей, хто лічыў яе пройдзеным этапам, учарашнім днём, паставіўшы на першае месца эстрадныя творы.*<br><br>**Адказ:** журналісцкай | 1) *журналісцкай* → значэнне слова ***журналісцкі*** – *які мае адносіны да журналістыкі*; слова ***журналісцкай*** адпавядае сэнсу сказа: *Шмат разоў даводзілася Рыгору Раманавічу Шырме займацца журналісцкай дзейнасцю – выступаць у друку, каб падтрымаць народную песню і пераканаць у адваротным тых людзей, хто лічыў яе пройдзеным этапам, учарашнім днём, паставіўшы на першае месца эстрадныя творы.*<br>2) *журнальнай* → значэнне слова ***журнальны*** – *які мае адносіны да журнала*; слова ***журнальнай*** не адпавядае сэнсу сказа | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Словы, яго лексічнае значэнне. Паронімы | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; С. 38.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 24 |
| **В8.** Устанавіце адпаведнасць паміж словамі ў левым слупку табліцы і іх фанетыка-арфаэпічнымі характарыстыкамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br>**А.** Пейнтбол.<br>**Б.** Адкіпелы.<br>**В.** Разнесены.<br>**Г.** Сцюдзёны.<br>**1.** Слова, у якім ёсць зычны гук [***ц’***].<br>**2.** Слова, у якім ёсць зычны гук [***т***].<br>**3.** Слова, у якім ёсць зычны гук [***з’***].<br>**4.** Слова, у якім ёсць зычны гук [***ц***].<br>**5.** Слова, у якім ёсць зычны гук [***д***]. | | | |
| **Адказ:** А5Б2В3Г1 | 1) *пейнтбол* → слова, у якім ёсць зычны гук [***д***]: [*п’эйн**д**бóл*];<br>2) *адкіпелы* → слова, у якім ёсць зычны гук [***т***]: [*а**т**к’іп’э́лы*];<br>3) *разнесены* → слова, у якім ёсць зычны гук [***з’***]: [*ра**з’**н’э́с’эны*];<br>4) *сцюдзёны* → слова, у якім ёсць зычны гук [***ц’***]: [*с’**ц’**удз’óны*] | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Зычныя гукі. Зычныя цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя; глухія, звонкія; свісцячыя і шыпячыя. Іх вымаўленне і правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 1–4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; §§ 13–15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13; практ. 82.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; §§ 6, 12 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **В9.** Узнавіце фразеалагізмы, прапанаваныя ў левым слупку табліцы, уставіўшы на месцы пропускаў лічэбнікі з правага слупка. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br>**А.** За **…** крокі. — **1.** адзін<br>**Б.** На **…** з плюсам. — **2.** два<br>**В.** На **…** зуб. — **3.** тры<br>**Г.** Бачыць на **…** сажні пад зямлёй. — **4.** чатыры<br>**5.** пяць | | | |
| **Адказ:** А2Б5В1Г3 | 1) *за два крокі* → фразеалагізм мае значэнне *‘зусім блізка, амаль побач’*;<br>2) *на пяць з плюсам* → фразеалагізм мае значэнне *‘вельмі добра, цудоўна’*;<br>3) *на адзін зуб* → фразеалагізм мае значэнне *‘вельмі мала, крышачку’*;<br>4) *бачыць на тры сажні пад зямлёй* → фразеалагізм мае значэнне *‘вызначацца вялікай праніклівасцю, прадпрымальнасцю’* | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 25 |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td colspan="4">B10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br>А. Перабудаваць.<br>Б. Узмежак.<br>В. Аздараўленне.<br>Г. Зоркападобны.<br>1. Абрэвіяцыя.<br>2. Асноваскладанне.<br>3. Прыставачна-суфіксальны.<br>4. Прыставачны.<br>5. Суфіксальны.</td></tr>
<tr><td>Адказ: А4Б3В5Г2</td><td>1) перабудаваць → слова ўтворана прыставачным спосабам: будава-(ць) + прыстаўка пера-;<br>2) узмежак → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: мяж-(а) + прыстаўка уз- і суфікс -ак-;<br>3) аздараўленне → слова ўтворана суфіксальным спосабам: аздараўл/я/-(ць) + суфікс -енн-;<br>4) зоркападобны → слова ўтворана шляхам складання асноў падобн-(ы) да зорк-(і) з дапамогай злучальнай літары а</td><td>Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Асноўныя спосабы ўтварэння слоў</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 31, 32, 34.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 24, 41, 70.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; §§ 18–20, 49, 54.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2020; § 19.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 25, 26.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, з</td></tr>
</table>

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | электронным дадаткам для павышанага ўзроўню. Мінск: НІА, 2020; § 26 |